УДК 739.2.033(476)

**Н. І. Наркевіч**, асістэнт (БДТУ)

# УПРЫГАЖЭННІ РУК ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ XII–XIV СТСТ. (ПАВОДЛЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ЗВЕСТАК)

Публікацыя прысвечана найбольш распаўсюджаным творам ювелірнага мастацтва на тэрыторыі Беларусі XII–XIV стст. – упрыгажэнням рук (бранзалетам і пярсцёнкам). Вызначаюцца адметныя асаблівасці ювелірных вырабаў па форме, матэрыяле, способах вырабу і характары дэкору. Бранзалеты і пярсцёнкі прадстаўлены амаль усімі тыпамі, характэрнымі для Старажытнай Русі. Асаблівая ўвага надаецца аналізу зааморфных, балцкіх па паходжанні бранзалетаў, непаўторным рысам вырабаў з каштоўных металаў, створаных беларускімі майстрамі. Семантычная нагрузка, канструктыўныя і выяўленчыя прынцыпы, пакладзеныя ў аснову ювелірных вырабаў, вызначаюцца выразнасцю і прастатой. Упрыгажэнні рук былі неад’емнай часткай касцюма жыхароў Беларусі XII–XIV стст.

This article deals with the art of jewelry in Belarus in the XII–XIV$^{th}$ centuries, principally adornments of hands (like bangles and seal rings). The author determines distinctive features of such jewelry by its form, material it was made of, mode of production, and design peculiarities. Practically all types of bangles and seal rings, specific for the ancient Russia, can be found in the article concerned. The author has specially studied zoomorphic and Baltic (by origin) bangles, and analyzed unique features of jewelry of precious metals, manufactured by the Belarusian masters. In the article bangles and seal rings have been also mentioned to save the integral part of the Belarusian traditional suit in the XII–XIV$^{th}$ centuries.

**Уводзіны.** Звязаныя з касцюмам ювелірныя ўпрыгажэнні, іх форма і канструкцыя адлюстроўвалі наяўную ў грамадстве сістэму ўяўленняў пра семантыку пабудовы цела чалавека, фарміравалі яго фізічную і духоўную існасць. Упрыгажэнні рук, да якіх адносяцца бранзалеты і пярсцёнкі, не былі ў касцюме выпадковымі, яны маркіравалі найбольш важныя часткі цела.

**Асноўная частка.** *Бранзалеты* з’яўляюцца найбольш распаўсюджанымі ўпрыгажэннямі на тэрыторыі Беларусі XII–XIV стст. Насілі іх як на правай, так і на левай руцэ ці на абедзвюх адначасова, іншы раз па некалькі штук – ад аднаго да васьмі. Вырабы адрозніваліся паміж сабой матэрыялам, формай, таўшчынёй, характарам аздаблення. У розны час назіраецца мода на пэўны тып бранзалета.

Папулярнасць у XII–XIII стст. мелі пераважна кручаныя, досыць тоўстыя ўпрыгажэнні рук, пазней моднымі становяцца тонкія гладкія бранзалеты. На Беларусі бытавалі амаль усе віды металічных бранзалетаў, вядомыя тагачаснай Усходняй Еўропе, а таксама зааморфныя, балцкія па паходжанні.

У X–XIII стст. былі пашыраны бронзавыя і медныя бранзалеты круглага сячэння з абрубленымі ці патончанымі (у радзімічаў і палачан таксама з расклёпанымі) канцамі, плеценыя, вітыя з завязанымі канцамі, рэльефныя, пласцінчатыя з канцамі ў выглядзе змяіных або звярыных галовак, створкавыя бранзалеты-наручы, лодкападобныя. Можна адзначыць і вырабы ювеліраў-ліцейшчыкаў – вітыя з петлепадобнымі канцамі, лжэкручаныя і лжэплеценыя бранзалеты.

Выдатнымі ўзорамі вырабаў з каштоўных металаў з’яўляюцца ўнікальны, масіўны (75, 472 г) залаты бранзалет XII–пачатку XIII ст. з Мінскага замчышча і вітый сярэбраны бранзалет X–XIII стст. з вішчынскага скарбу [1; 2, с. 139]. Асабліва звяртае на сябе ўвагу аздабленне бранзалета з Мінска. Упрыгажэнне сплецена з трох складзеных удвая і перавітых паміж сабой залатых тоўстых дротаў, на абодвух канцах яго адлюстраваны стылізаваныя галовы драконаў.

Звера- і змяінагаловыя вырабы зарадзіліся практычна адначасова з самімі металічнымі ўпрыгажэннямі і належаць да перыяду энеаліту. Вельмі папулярнымі былі бранзалеты, грыўні і дыядэмы, упрыгожаныя звярынымі галоўкамі, і ў перыяд антычнасці. З усяго набору звярыных вобразаў (грыфоны, ільвы, змеі, драконы, птушкі) толькі змеі і драконы былі папулярнымі ва ўсе наступныя эпохі. Пры аналізе паходжання бранзалетаў са змяінымі і драконавымі галовамі на тэрыторыі Старажытнай Русі В. Левашова адзначае, што дадзены матыў быў захаваны ў візантыйскім ювелірным мастацтве і ў канцы І тыс., адкуль перанесены на тэрыторыю Усходняй, Цэнтральнай Еўропы і ў Скандынавію [3, с. 216]. Разнастайныя бранзалеты з драконавымі галовамі выраблялiся візантыйскімі майстрамі для вандроўнай знаці і ў эпоху Вялікага перасялення народаў, і ў больш позні час [4; 5, с. 235].

Традыцыя вырабу і нашэння металічных упрыгажэнняў з зааморфнымі канцамі знайшла

працяг у ювелірнай справе Сярэднявечча ў выніку культурных стасункаў з краінамі Балтыйскага рэгіёну і Паўночнай Еўропы. Гэты феномен можна растлумачыць як устойлівасцю традыцый у ювелірнай справе, так і семантычнай нагрузкай вобразаў змяі і дракона ў светаўспрыманні і фальклоры шматлікіх народаў, якая прыводзіць да самастойнага з'яўлення падобных упрыгажэнняў.

Ёсць падставы лічыць, што і каштоўны бранзалет з Мінскага замчышча прывезены з вострава Готланд, што ў Балтыйскім моры (Швецыя) [1]. Бранзалеты з Готланда вельмі падобныя да залатога ўпрыгажэння з Беларусі.

Папулярнасць вобраза змяі ў дэкоры ўпрыгажэнняў звязана з яе заступніцкай сімволікай. Сама форма бранзалета нагадвае скручанае змяінае цела. Вырабы, якія завяршаюцца драконавымі галовамі, у параўнанні з вырабамі са змяінымі, адрозніваюцца больш складанай тэхнікай выканання, старannай прапрацоўкай дэталяў, вялікай разнастайнасцю тыпаў вырабаў. Мордачкі драконаў адрозніваюцца ад змяіных галовак, на якіх, як правіла, паказаны толькі круглыя вочы і рот (часам – ноздры і луска), колам характэрных прыкмет. Да іх можна аднесці міндалепадобную форму выпуклых вачэй, графічнае або аб'ёмнае вызначэнне носа, які пераходзіць у бровы. У драконаў часцей паказаны і вушкі (звычайна яны прыціснуты да галавы), вызначаны пераход ад галавы да шыі жывёлы, на некаторых вырабах бачны і зубы.

Галоўкі-наканечнікі бранзалетаў, на якіх пададзены і звярыныя, і змяіныя рысы, мэтазгодна разглядаць як драконавы. Менавіта гэтыя дзве катэгорыі вобразаў – змяі і дракона – былі асноваўтваральнымі ў дэкоры падобных упрыгажэнняў.

Прастата і выразнасць кампазіцыі найбольш раскрываюцца ў дэкоры пласцінчатых бранзалетаў XII–XIII стст. Сярод іх вылучаюцца вырабы са стылізаванымі зааморфнымі канцамі, бранзалеты з пашыранымі канцамі і цiснёным геаметрычным арнаментам, пласцінчатыя тупаканцовыя.

Арнамент на гарадскіх пласцінчатых бранзалетах быў больш складаны і разнастайны, чым на вясковых. На знешні выгляд геаметрычных узораў, магчыма, уплывалі разьба па дрэве, строгія народныя вышыўкі, але іх змест звязаны з адзінай для ўсіх відаў мастацтва язычніцкай сімволікай. Геаметрычны арнамент бытаваў пераважна да XIII ст., затым з'явіліся элементы расліннага, дзе кожны матыў лічыўся абярэгам.

Пласцінчатыя створкавыя бранзалеты-наручы з'явіліся на Беларусі ў XII ст. і былі кампанентам дэкору святочнага адзення знатных жанчын з доўгімі шырокімі рукавамі. Першыя бранзалеты з шарнірным мацаваннем паходзяць з антычнасці, верагодна, яны ўзніклі пад моцным уплывам усходнеіранскага мастацтва апрацоўкі металу. У час ранняга Сярэднявечча шырокія створкавыя бранзалеты з шарнірным мацаваннем выраблялі майстры Візантыі.

На тэрыторыі Старажытнай Русі створкавыя пласцінчатыя бранзалеты насілі ў складзе гарадскога ювелірнага ўбрання з чарненнем. Майстры не паўтаралі візантыйскія творы літаральна, разам з тым частка сюжэтаў на старажытнарускіх і візантыйскіх бранзалетах супадае. На Беларусі ювелірныя вырабы знойдзены ў Полацку, Пінску, Гродне, Слоніме, Друцку, на месцах феадальных сядзіб каля вёсак Рамана Горацкага і Вішчын Рагачоўскага раёнаў [6, с. 36].

Выдатным узорам работы беларускіх майстроў у такой стылістыцы з'яўляецца сярэбраны створкавы бранзалет з вішчынскага скарбу. Упрыгажэнне мае выгляд пласцінчатага сярэбранага абруча з дзвюх створак, злучаных шарнірамі. Бранзалет уражвае непаўторнасцю дэкаратыўных элементаў і высокім майстэрствам выканання. Фон ўпрыгажэння выкананы разцом і пакрыты чарненнем. На старажытнарускіх бранзалетах чарненнем пакрываўся фон, і толькі ў позніх узорах XIII–XV стст. яно запаўняла лініі гравіраванага аздаблення. Асаблівай складанасцю адрозніваюцца малюнкі на створкавых бранзалетах-наручах з вішчынскага скарбу. Дэкаратыўныя элементы тут на першым месцы. З арнаментальных сюжэтаў асабліва цікавыя выявы птушак і крына, да якіх неаднаразова звярталіся беларускія ювеліры.

На бранзалетах, якія вырабляліся ў тэхніцы ручнога выбівання, цiснення або ліцця, выявы плоскія, гравіраваныя. На створкавых бранзалетах-наручах яны размяшчаюцца ў адзін або два ярусы і знаходзяцца ў прамавугольных ці кіётападобных і паўкруглых арачках, выдзеленых псеўдасканню ці арнаментам. Акрамя літых бранзалетаў, якія арнаментацыяй нагадвалі творы, выкананыя ў тэхніцы выбівання і цiснення (выявы фантастычных жывёл, ПТУшак, пляцёнка), былі ювелірныя ўпрыгажэнні з геаметрычным арнаментам і псеўдазярнёнымі кампазіцыямі. Асноўным месцам пашырэння літых бранзалетаў быў Ноўгарад. Разам з тым цікавымі ўзорамі літых створкавых бранзалетаў з'яўляюцца вырабы з Беларусі – з Гродна, Полацка, Пінска.

На тэрыторыі Старажытнай Русі аздабленне створкавых бранзалетаў псеўдазярненнем пашырэння не мела. Тым не менш на Беларусі

гэты прыём узнік пад уплывам балканскіх узораў. У сярэдзіне XIII ст. цэнтр вытворчасці бранзалетаў з псеўдазярненнем перамясціўся ў заходнія землі Старажытнай Русі. У рэгіёне, дзе быў моцны ўплыў культуры балканскіх краін, гэты тып бранзалетаў праіснаваў да XIV ст., а на думку Т. Макаравай, – і да XV ст. [7, с. 91].

Эвалюцыя створкавых бранзалетаў ішла ад складаных вобразаў да простых, да схематызацыі. Нягледзячы на гэта, мясцовыя асаблівасці надалі ювелірным вырабам своеасаблівыя непаўторныя рысы.

*Пярсцёнкі* з'яўляюцца даволі распаўсюджанай катэгорыяй упрыгажэнняў на Беларусі ў XII–XVI стст. Тлумачыцца гэта вялікім значэннем пярсцёнка сярод насельніцтва Старажытнай Беларусі ва ўрачыстай абраднасці.

На першы погляд, пярсцёнкі адрозніваюцца ад бранзалетаў толькі памерамі і прызначэннем. На самой справе розніца ў памерах раскрывае новыя значныя адрозненні. Формы пярсцёнкаў асабліва разнастайныя дзякуючы зменам цэнтральнай часткі ўпрыгажэння. Яна ўскладняецца пячаткамі, устаўнымі камянямі, упрыгожваецца прораззю, пашыраецца так, што набывае розныя формы.

Пярсцёнкі на тэрыторыі Беларусі прадстаўлены амаль усімі тыпамі, характэрнымі для Старажытнай Русі. Сярод іх розныя віды пласцінчатых, кругладрацяных, гладкіх, рубчастых, спіральных, вітых, псеўдавітых, плеценых. Найбольш простая і ранняя форма пярсцёнкаў прадстаўлена кругладрацянымі вырабамі, вельмі падобнымі да скроневых пярсцёнкападобных колцаў.

Упрыгажэнні, вырабленыя з золата, серабра, бронзы, волава, білону, бурштыну, медзі, знойдзены ў многіх гарадах Беларусі. Залаты дротавы пярсцёнак з разамкнёнымі заходзячымі канцамі паходзіць з калекцыі віцебскіх упрыгажэнняў XII ст. [8, с. 121].

Пярсцёнкі з плеценай сярэдзіннай часткай і сплошчанымі разамкнёнымі канцамі былі даволі папулярнымі сярод жыхароў Полацка, Друцка, Турава. Найбольшую цікавасць уяўляе залаты пярсцёнак з заходзячымі канцамі пачатку XIV ст. з Бярэсця [9, с. 110]. Ён сплецены з шасці падвоеных дротаў, пракаваных на канцах у прамавугольны завужаны дрот. З Навагрудка паходзіць залаты выраб з каменем, вузкая пласцінка якога падзелена перахопамі на роўныя часткі з лацінскай літарай у кожнай з іх. Цікавыя экзэмпляры вырабаў знойдзены ў Полацку: два бронзавыя пярсцёнкі рубяжа XII–XIII стст. са шклянымі ўстаўкамі, а ў слоі першай паловы XIII ст. – білонавы пазалочаны пярсцёнак-пячатка з шасцівугольным шчытком, на якім выгравіравана выява птушкі з распасцёртымі крыламі [10, с. 395].

На працэс фарміравання самабытнай традыцыі ў ювелірным мастацтве Беларусі XII – XIV стст. аказвалі ўплыў асаблівасці візантыйскай і старажытнарускай мастацкіх школ, спосаб мыслення і пачуццяў, уласцівых Сярэднявеччу.

**Заключэнне.** Семантычныя, канструктыўныя і выяўленчыя прынцыпы, пакладзеныя ў аснову ўпрыгажэнняў рук, вызначаюцца выразнасцю і прастатой. Гэта было своеасаблівае абагульненне, прадстаўленае ў выглядзе знака, змест якога быў зразумелы кожнаму члену грамадства. На прыкладзе ювелірных упрыгажэнняў можна бачыць, як самыя розныя вырабы служылі неад'емнай часткай адзення.

## Літаратура

1. Загорульский, Э. М. Возникновение Минска / Э. М. Загорульский. – Минск: БГУ, 1982. – 358 с.
2. Загорульский, Э. М. Вищинский замок XII–XIII вв. / Э. М. Загорульский. – Минск: БГУ, 2004. – 159 с.
3. Левашева, В. П. Браслеты / В. П. Левашева // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – М.: Советская Россия, 1967. – С. 207–252.
4. Hasson, R. Early Islamic jewelry / R. Hasson. – Jerusalem: L. A. Mayer Memorial Inst. for Islamic Art, 1987. – 111 p.: ill.
5. Рябцева, С. С. Змеи и драконы. О продолжении одной античной традиции в ювелирном деле эпохи средневековья / С. С. Рябцева // Stratum plus. – СПб.; Кишинев; Одесса; Бухарест, 1999. – № 3. – С. 228–240.
6. Дучыц, Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст: паводле археал. звестак / Л. У. Дучыц; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 80 с.
7. Макарова, Т. И. Черневое дело Древней Руси / Т. И. Макарова. – М.: Наука, 1986. – 153 с.
8. Бубенька, Т. Ювелірныя ўпрыгожанні Віцебска X–XIV стст.: па матэрыялах даслед. Ніжняга замка / Т. Бубенька // З глыбі вякоў. Наш край: гіст.-культурал. зб. / навук. рэд. А. К. Краўцэвіч. – Мінск, 1996. – Вып. 1. – С. 110–131.
9. Лысенко, П. Ф. Открытие Берестья / П. Ф. Лысенко. – Минск: Белорус. наука, 2007. – 181 с.
10. Археалогія Беларусі: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 1998–2001. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. – 2001. – 597 с.

*Паступіла 30.03.2011*